3КП5(4Бел)
Т19

АГРАРНАЯ ПАЛІТЫКА КПСС У ДЗЕЯННІ

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Г. С. ТАРАЗЕВІЧ,
А. А. ГОДАЎ

# У АДНЫМ СТРАІ З ХЛЕБАРОБАМІ

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

3КП2-63(4Ч1)
Т19

АГРАРНАЯ
ПАЛІТЫКА
КПСС
У ДЗЕЯННІ

Г. С. ТАРАЗЕВІЧ,
А. А. ГОДАЎ

# У АДНЫМ СТРАІ З ХЛЕБАРОБАМІ

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Ф. К.

Урадавая бібліятэка
імя А. Горкага
інв № 920160 АБ

Президентская библиотека
Республики Беларусь
8 800001 040515

Ф. К.

МІНСК
«БЕЛАРУСЬ»
1981

ББК 66.61(2Б)
Т 19

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Т $\frac{40100-080}{М\ 301(05)-81}$ 025—81 0902060000

© Выдавецтва
«Беларусь», 1981

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Сельская гаспадарка — адна з найбольш важных галін сацыялістычнай эканомікі, ад паспяховага развіцця якой залежыць няўхільны рост матэрыяльнага дабрабыту савецкіх людзей, далейшае развіццё прамысловасці.

Партыя і ўрад на ўсіх этапах сацыялістычнага будаўніцтва ўдзялялі і ўдзяляюць неаслабную ўвагу развіццю сельскай гаспадаркі. Сакавіцкі (1965 г.) Пленум ЦК КПСС паклаў пачатак новаму этапу ажыццяўлення ленінскай аграрнай палітыкі партыі.

Выключна важнай вяхой на шляху далейшага прагрэсу сельскай гаспадаркі, удасканалення ўсёй сістэмы эканамічных, матэрыяльна-тэхнічных, арганізацыйна-палітычных мер, накіраваных на паспяховае вырашэнне праблем сяла, з'явіўся ліпеньскі (1978 г.) Пленум ЦК КПСС. У дакладзе Л. І. Брэжнева на Пленуме глыбока і ўсебакова прааналізаваны вынікі развіцця сельскай гаспадаркі краіны за апошнія гады, рэльефна акрэслена панарама вялікіх спраў і буйнамаштабных задач, якія трэба будзе рашыць у бліжэйшым будучым, выпрацавана праграма дзеянняў для партыйных арганізацый, усіх кадраў.

Партыя выказала цвёрдую ўпэўненасць у тым, што ўсе калгасы, саўгасы, вучоныя, работнікі прамысловасці, усе працаўнікі горада і вёскі сваёй працай забяспечаць паспяховае выкананне рашэнняў Пленума. Мінчане, глыбока ўсвядоміўшы свой абавязак перад працаўнікамі вёскі, пераклалі словы партыйных дакументаў на канкрэтную мову практычнай работы.

Працоўныя сталіцы ўжо многія гады аказваюць дапамогу вёсцы. Пастанова ліпеньскага Пленума ЦК КПСС пашырыла і паглыбіла яе, зрабіла яшчэ больш дзейснай, яшчэ больш канкрэтнай, яшчэ больш эфектыўнай. Бадай, няма ў Мінску ніводнага калектыву, які б не ўносіў свой пасільны ўклад у высакародную справу дапамогі вёсцы.

Гарадская партыйная арганізацыя ўзначаліла работу па аказанню дапамогі працаўнікам вёскі ў інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і мае пэўны вопыт у наладжванні дзейснага шэфства горада над вёскай. Можна выдзеліць два асноўныя напрамкі ў гэтай рабоце: удасканальванне работы прадпрыемстваў і арганізацый, прадукцыя якіх прызначаецца для сельскай гаспадаркі; умацаванне і развіццё шэфскай дапамогі вёсцы.

Гэтыя напрамкі ўзаемазвязаны паміж сабой і складаюць адзіную праграму дзейнасці працоўных калектываў горада, партыйных арганізацый па аказанню дапамогі працаўнікам вёскі. Увага камуністаў гарадской партыйнай арганізацыі да вырашэння гэтых праблем была выказана ў рашэннях пленума гаркома КПБ, што адбыўся 9 жніўня 1978 года і абмеркаваў задачы партыйных арганізацый горада па ажыццяўленню рашэнняў ліпеньскага (1978 г.) Пленума ЦК КПСС і ўказанняў, дадзеных Генеральным сакратаром ЦК КПСС, Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР тав. Л. І. Брэжневым у час знаходжання ў Мінску. Гэтыя ўказанні маюць асаблівае значэнне для рабочага і інжынера, вучонага і служачага, студэнта і школьніка Мінска. Яны поўныя гарачага імкнення паспяхова іх ажыццяўляць.

У кнізе расказваецца аб тым, як партыйная арганізацыя сталіцы нашай рэспублікі на справе ажыццяўляе рашэнні партыі па ўзмацненню шэфскай сувязі працаўнікоў горада з работнікамі сельскай гаспадаркі.

# СЭРЦАМ УСПРЫНЯЛІ — СПРАВАЙ АДКАЗАЛІ

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Багатая і цікавая пасляваенная гісторыя Мінска. Адразу пасля вызвалення сталіцы Беларусі Камуністычная партыя і ўрад рэспублікі заклікалі працоўных хутчэй адрадзіць да жыцця заводы і фабрыкі, калгасы, школы, бальніцы, што ляжалі ў руінах. Гэта была цяжкая задача, але беларускі народ вырашыў яе ў самы кароткі час. Уся краіна дапамагала аднаўляць разбураную гітлераўцамі гаспадарку.

Мінск узняўся з руін, устаў з попелу новы прыгажун са сваімі шырокімі вуліцамі, паркамі, бульварамі, плошчамі. У горадзе выраслі гіганты сацыялістычнай індустрыі: трактарны і аўтамабільны заводы, узняліся карпусы падшыпнікавага, электратэхнічнага, станкабудаўнічага і дзесяткаў іншых заводаў. Іх прадукцыя ідзе ва ўсе куткі нашай Радзімы і за мяжу. У шасцідзесяці краінах свету ведаюць сёння мінскія трактары і аўтамабілі, падшыпнікі і рухавікі.

Больш сарака прамысловых прадпрыемстваў горада пастаўляюць для сельскай гаспадаркі розную тэхніку і абсталяванне. Аб'ём гэтай прадукцыі ўзрастае з году ў год.

Калі ў 1975 годзе было выпушчана прамысловых вырабаў, прызначаных вёсцы, на пяцьсот мільёнаў рублёў, то ў 1979 — больш як на шэсцьсот мільёнаў.

Пераважная большасць працоўных калектываў горада з пачуццём высокай адказнасці ставіцца да выканання заказаў вёскі. А рэалізацыя іх знаходзіцца пад пастаянным кантролем гаркома, райкомаў, пярвічных партыйных арганізацый. І не выпадкова, на прадпрыемствах горада нараджаюцца і ўкараняюцца ў практыку каштоўныя патрыятычныя пачыны, якія садзейнічаюць павышэнню тэхнічнага ўзроўню, надзейнасці і даўгавечнасці сельскагаспадарчай тэхнікі.

На аўтамабільным, трактарным, маторным, электратэхнічным і іншых заводах паспяхова ўкаранёны шэраг важных мерапрыемстваў, якія дазволілі значна палепшыць тэхнічныя характарыстыкі вырабаў. У прыватнасці, маторабудаўнікі знізілі расход масла на ўгар, павысілі эканамічнасць рухавікоў, вядуць работы па павелічэнню яго рэсурса з шасці да васьмі тысяч мотагадзін. Цяпер аўтамабілі МАЗ, усе мадэлі трактароў сямейства «Беларусь», а таксама маторы, шмат якія трансфарматары, трансфарматарныя падстанцыі і запасныя часткі выпускаюцца з дзяржаўным Знакам якасці.

Калектыў трактарнага завода вырашыў адказную задачу — галоўную ў дзесятай пяцігодцы — ажыццявіў пераход на выпуск трактара МТЗ-80/82. Трактар гэтай маркі прызнаны лепшай машынай гэтага класа ў краіне. Такой візітнай карткі, як «васьмідзесятка», не мае ніводзін айчынны колавы трактар. Па магутнасці, паліўнай эканамічнасці, вагавых паказчыках, рэсурса да першага капітальнага рамонту ён адпавядае ўзроўню сучаснага трактарабудавання. Па універсальнасці, наяўнасці рабочага і дапаможнага абсталявання перавышае ўзровень замежных узораў.

Як баявую праграму дзеянняў успрынялі трактаразаводцы рашэнні ліпеньскага Пленума ЦК КПСС. Цяпер ужо канструктарская думка ўвасобіла ў метал трактар «Беларусь-142» магутнасцю 150 конскіх сіл. Яго выпуск плануецца ў адзінаццатай пяцігодцы.

Партыйныя, прафсаюзныя, камсамольскія арганізацыі цэхаў і аддзелаў пастаянна клапоцяцца аб тым, каб кожны заводскі працаўнік ясна бачыў перспектыву, дакладна ведаў рубяжы, якія трэба ўзяць.

На заводзе з даўняга часу ідзе баявое спаборніцтва. У працоўным саперніцтве ўдзельнічаюць амаль усе рабочыя і служачыя. Звання камуністычных удастоены калектывы пяці цэхаў, двух аддзелаў, 166 брыгад, 11 участкаў і змен, 17 тысяч перадавікоў вытворчасці атрымалі званні ўдарніка камуністычнай працы.

Гарачую падтрымку на заводзе знайшоў заклік кавалёў аб стварэнні комплексных брыгад эфектыўнасці і якасці. Ён заснаваны на прынцыпе «Рабочай ініцыятыве — інжынерную падтрымку». У састаў брыгад увайшлі майстры, тэхнолагі, наладчыкі, кантралёры. Працоўнае саперніцтва комплексных брыгад атрымала надзейную тэхнічную апору. У працоўнай садружнасці яны паспяхова рашаюць задачы па скарачэнню норм расходу металу, адшукваюць шляхі больш беражлівага яго выкарыстання. Шырокае распаўсюджанне атрымала спаборніцтва скразных брыгад, якія працуюць па адзінаму нараду. Іх вызначае зладжанасць у рабоце, камуністычныя адносіны да працы.

Вялікую ўвагу партыйны камітэт і цэхавыя партыйныя арганізацыі ўдзяляюць распаўсюджванню пачынаў перадавікоў і наватараў вытворчасці, укараненне якіх садзейнічае паспяховай рабоце калектыву. Рабочыя ўчасткі канічных шасцерань пятага механічнага цэха, які ўзначальвае камуніст Л. У. Гулян, з'явіліся ініцыятарамі спаборніцтва за датэрміновае выкананне задання па выпуску запасных частак да трактароў і сельгасмашын. Ініцыятыва была адобрана калегіяй Міністэрства трактарнага і сельскагаспадарчага машынабудавання, ЦК галіновага прафсаюза. Гарачы водгук сярод трактарабудаўнікоў атрымаў пачын «Заказам вёскі — высокую якасць».

...Лета 1978 года выдалася дажджлівым. Па палях, як кажуць, немагчыма было ні прайсці, ні праехаць. Цяжка даводзілася ў тыя дні працаўнікам сельскай гаспадаркі. Механізатарам трэба было «абуць» заднія колы трактароў «Беларусь», каб павялічыць іх праходнасць. Вось тады на завод і прыйшоў тэрміновы заказ сельскіх механізатараў — вырабіць спецыяльныя прыстасаванні для работы трактароў на пераўвільготненых участках.

За справу ўзяліся кавалі. Яны разумелі, што дарагая кожная гадзіна. Работа вялася ўдзень і ўначы. Даводзілася прыходзіць на рабочыя месцы і ў выхадныя дні. Зменныя заданні па выфабу глебазачэпаў усе брыгады перакрывалі ў паўтара раза. Спачатку наперадзе ішоў калектыў, які ўзначаліў Н. А. Макоўскі. За змену ён паспяваў рабіць тры тысячы дэталей замест тысячы васьмісот па норме. Але хутка гэты рэкорд быў пабіты брыгадай Н. В. Скрыпко. Яна здолела за змену вырабіць тры тысячы чатырыста зачэпаў, перакрыўшы заданне амаль удвая. За чатыры дні кавалі трактарнага завода справіліся з тэрміновым заказам вёскі.

Трактаразаводцаў заўсёды вызначала высокая выканаўчая дысцыпліна. У 1979 годзе тысячы мінчан выехалі ў калгасы і саўгасы, каб дапамагчы назапасіць больш кармоў для грамадскай жывёлагадоўлі.

На завод паступіла просьба: у сціслыя тэрміны вырабіць вялікую колькасць нажоў для нарыхтоўкі галінак. І зноў закіпела натхнёная праца рабочых, інжынераў і тэхнікаў. Літаральна на працягу некалькіх сутак трактаразаводцы справіліся з адказным заданнем.

На прадпрыемстве асвоены таксама выпуск дэталей і вузлоў для новай жняяркі ЖСК-4ам. Удасканаленне тэхналогіі іх вытворчасці дазволіла датэрмінова выканаць заданне. У 1979 годзе было выраблена дзве з палавінай тысячы камплектаў для гэтай машыны.

Выпуск дэталей і вузлоў для жняярак і камбайнаў асвоілі практычна ўсе буйныя прамысловыя прадпрыемствы Мінска. Трэба сказаць, што заказ працаўнікоў вёскі яны паспяхова выконваюць. Завод шасцерань вырабіў і паставіў сельскай гаспадарцы дванаццаць тысяч зубчатых колаў да самаходнага кормаўборачнага камбайна, дзевяць тысяч нажоў і сем тысяч разакоў да жняярак, прызначаных для ўборкі палеглай збажыны. Тут своечасова створаны і асвоены магутнасці па вырабу канічных пар для ўборачных камбайнаў.

Намаганні партыйных і савецкіх органаў, прадпрыемстваў горада па арганізацыі вельмі неабходных ва ўмовах рэспублікі прыстасаванняў да жняярак для ўборкі палеглай збажыны далі свой добры плён. За апошнія гады іх выраблена некалькі тысяч. 65 заводаў Мінска дадаткова адшукалі магчымасці выпусціць сельгасмашын, абсталявання і запасных частак да сельскагаспадарчай тэхнікі амаль на дзесяць мільёнаў рублёў. Дасягнута гэта за кошт сэканомленага металу. На эксперыментальным заводзе паспяхова вырабляюць раздатчыкі-змяшальнікі кармоў, разгрузчыкі камбікармоў з вагонаў, абсталяванне для ферм буйной рагатай жывёлы, пункты пераборкі насеннай бульбы. На заводзе імя С. І. Вавілава робяць дэталі для дажджавальнай устаноўкі, на заводзе «Прамтэхмантаж» — сіласаправод да кормаўборачнага камбайна.

На Мінскім аўтамабільным заводзе рамантуюцца калгасныя аўтамашыны, вырабляюцца розныя агрэгаты і прыстасаванні для сельскагаспадарчых работ. Вясной васьмідзесятага года аўтазаводцы вырабілі і адправілі ў гаспадаркі падшэфнага Бярэзінскага раёна партыю машын для ўнясення ў глебу вадкіх угнаенняў.

Вялікую працоўную перамогу атрымалі работнікі завода, якія прынялі ўдзел у праектаванні і стварэнні комплексу высокапрадукцыйных машын для ўнясення мінеральных угнаенняў. Гэта буйны творчы поспех канструктараў, інжынераў, рабочых. Працаўнікі вёскі атрымалі высокаэфектыўную тэхніку для выканання важных работ, якія садзейнічаюць павышэнню ўраджайнасці палёў.

Тыя, хто асабліва вызначыўся, узнагароджаны Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. Сярод іх — намеснік галоўнага канструктара Беларускага аб'яднання па вытворчасці вялікагрузных аўтамабіляў імя 60-годдзя Вялікага Кастрычніка І. Ф. Дземідовіч, інжынер-выпрабавальнік В. І. Елісеенка, начальнік аддзела С. Г. Кокін, токар В. І. Кулеш, брыгадзір слесараў В. Л. Лукашэвіч.

Вялікія работы па электрыфікацыі аб'ектаў сельскай гаспадаркі выконваюць работнікі трэста «Белэнергабудмантаж». Толькі за апошнія два гады яны ажыццявілі будаўніча-мантажных работ на вёсцы больш чым на восем мільёнаў рублёў. Здадзены ў эксплуатацыю каля тысячы аб'ектаў. Мінскія электрыкі пабудавалі ў сталічнай вобласці некалькі соцень кіламетраў ліній электраперадач, каля двухсот трансфарматарных падстанцый.

Добрую дапамогу працаўнікам вёскі аказваюць мінскія работнікі сельскагаспадарчай авіяцыі. Аб'ём авіяработ з году ў год павялічваецца. Трэба адзначыць правафланговых спаборніцтва авіятараў, якія ўносяць дастойны ўклад у справу дапамогі вёсцы. За 1978, 1979 гады і сем месяцаў 1980 года заданне дзесятай пяцігодкі па апрацоўцы сельскагаспадарчых плошчаў выканаў экіпаж самалёта Ан-2, які ўзначальвае малады камуніст Генадзь Бондараў.

Мінскі авіяатрад дапамагае сельскім працаўнікам матэрыяламі, абсталяваннем, машынамі, запчасткамі. Авіятары будуць і ў далейшым развіваць і ўмацоўваць свае сувязі з вёскай. Гэта занатавана ў сацыялістычных абавязацельствах па дастойнай сустрэчы XXVI з'езда КПСС.

Мінскае гарадское вытворчае ўпраўленне грузавога аўтатранспарту перавозіць грузы для арганізацый Міністэрства сельскага будаўніцтва, меліярацыі і воднай гаспадаркі рэспублікі, «Белміжкалгасбуда», якія будуюць аб'екты сельскагаспадарчага прызначэння на тэрыторыі Мінскай вобласці. Упраўленне займаецца таксама перавозкамі сельскагаспадарчай прадукцыі. Штогод каля трохсот аўтамабіляў заняты на гэтай рабоце. За адзін рэйс аўтамашыны перавозяць больш дзвюх тысяч тон сельскагаспадарчых грузаў. На такіх аўтамабілях, як правіла, ушчыльнены кузавы, каб не дапускаць страт збожжа, клубняў, зялёнай здробненай масы. Для работы на гэтых аўтамабілях накіроўваюцца лепшыя вадзіцелі ўпраўлення.

Прыведзеныя вышэй прыклады з гранічнай дакладнасцю сведчаць, што працоўныя Мінска ўсім сэрцам успрынялі гістарычныя рашэнні ліпеньскага (1978 г.) Пленума ЦК КПСС. Вестка аб скліканні XXVI з'езда партыі выклікала новы прыліў творчага энтузіязму.

## САДРУЖНАСЦЬ

З кожным годам расце і шырыцца шэфская дапамога мінчан працаўнікам вёскі. Яе атрымліваюць больш чым 450 калгасаў і саўгасаў у 18 раёнах сталічнай вобласці. Гэта работа вядзецца на падставе дагавораў, якія складзены ў адпаведнасці з распрацаванымі перспектыўнымі і бягучымі планамі развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці і з'яўляюцца адным з асноўных пунктаў сацыялістычных абавязацельстваў калектываў прамысловых прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый сталіцы рэспублікі.

Значна павялічылася матэрыяльна-тэхнічная дапамога горада сельскай гаспадарцы. Толькі за апошнія гады ў падшэфных калгасах і саўгасах мінчане пабудавалі сянажных збудаванняў агульнай ёмістасцю больш чым на 100 тысяч тон, сто машынных двароў, звыш ста жылых дамоў, трыццаць клубаў, дваццаць шэсць ліній электраперадач. Шэфы механізавалі дзвесце кароўнікаў і свінарнікаў, адрамантавалі каля пяці тысяч адзінак сельскагаспадарчай тэхнікі, перадалі паўтары тысячы тон металу, будаўнічых матэрыялаў на суму больш трох мільёнаў рублёў.

Дзелавыя сувязі ўстанавіў, напрыклад, калектыў домабудаўнічага камбіната № 3 з рабочымі саўгаса «Шыпяны» Смалявіцкага раёна. Шэфы распрацавалі праект цэха па прыгатаванню кармоў, зрабілі неабходныя жалезабетонныя канструкцыі, змантыравалі абсталяванне. Калектыў камбіната аказаў дапамогу ў збудаванні зернесушыльнага комплексу, адрамантаваў некалькі вытворчых, культурных і бытавых аб'ектаў.

Добрай славай у сельскіх працаўнікоў Любанскага раёна карыстаецца калектыў Мінскага вытворчага аб'яднання індустрыяльнага домабудавання. У падшэфных гаспадарках сіламі будаўнікоў узведзены чатыры жывёлагадоўчыя фермы, ёмістасці для захоўвання аміячнай вады. Дапамаглі запаснымі часткамі для сельскагаспадарчай тэхнікі, будаўнічымі матэрыяламі.

Вялікі вопыт шэфскай работы набыў калектыў «Белэнергарамналадка». У першы свой прыезд у калгас «Праўда» Вілейскага раёна наладчыкі звярнулі ўвагу, што сельскагаспадарчая тэхніка стаіць пад адкрытым небам, праз гэта дачасна выходзіць са строю. Канструктары прадпрыемства распрацавалі праект павеці для захоўвання трактароў, камбайнаў, сеялак, культыватараў. Затым пабудавалі яе. Атрымалася зручнае памяшканне для захоўвання сельгастэхнікі. Работнікі прадпрыемства затым пабудавалі ў калгасе механічную майстэрню, што дазволіла палепшыць падрыхтоўку машын да сяўбы і ўборкі ўраджаю. А калі вынікае патрэба, дык шэфы дапамагаюць

рамантаваць тэхніку. Напрыклад, падрыхтоўку камбайнаў вядуць непасрэдна ў сваіх цэхах.

Вось ужо некалькі гадоў запар шэфы прымаюць актыўны ўдзел ва ўборачных работах. Яны рыхтуюць шэсць зернеўборачных камбайнаў і ўкамплектоўваюць іх сваімі экіпажамі. На ўборцы камбайнеры-шэфы спаборнічаюць з прафесіянальнымі калгаснымі механізатарамі. Так, экіпаж, узначальваемы слесарам Бандарэнка, выйшаў пераможцам у сацыялістычным спаборніцтве на жніве 1978 года. Гэта стала нечаканасцю для камбайнераў калгаса, і аўтарытэт шэфаў невымерна вырас. А вось у наступным годзе калгасныя механізатары ўпэўнена перамаглі.

Аналізуючы шэфскую работу на пасяджэнні партбюро, камуністы прадпрыемства адзначылі, што яны іншы раз выкарыстоўваюцца на другарадных работах. Праца іх у такім выпадку становіцца малаэфектыўнай. Было гэта, у прыватнасці, на сарціроўцы і адгрузцы бульбы. І вось спецыялісты прадпрыемства спраектавалі і пабудавалі цэлы комплекс для сарціроўкі бульбы і такім чынам цалкам механізавалі гэты працэс.

Калектыў прадпрыемства ганарыцца тым, што яго бескарыслівая дапамога працаўнікам вёскі дае свой плён. Яго радуюць поспехі падшэфнага калгаса. Валавы збор зерня ў гаспадарцы павялічыўся больш чым удвая. Значна ўзрасла вытворчасць мяса і малака. У гэтых поспехах, безумоўна, ёсць немалы ўклад шэфаў.

Калектыў Мінскага ордэна Леніна завода электронных вылічальных машын імя Г. К. Арджанікідзе шэфствуе над калгасамі «Зара», «Шлях да камунізму», імя Калініна, саўгасамі «Осаўскі» Мядзельскага, «Волма» Мінскага і «Праца» Валожынскага раёнаў. Дружба гэта з кожным годам расце і мацнее. Рабочыя аказваюць адчувальную дапамогу земляробам і жывёлаводам у будаўніцтве і абсталяванні зерняскладоў, жывёлагадоўчых ферм, рамонце тэхнікі, правядзенні сяўбы і ўборкі ўраджаю. Для патрэб вёскі прадпрыемства штогод выдзяляе вялікую колькасць механізмаў, запасных частак, рыхтуе кадры трактарыстаў, камбайнераў, рамонтнікаў.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы